Адбылося пасяджэнне беларускай часткі рабочай групы па развіцці супрацоўніцтва з Курскай вобласцю Расійскай Федэрацыі ў фармаце відэаканферэнцыі

Сёння, 13 красавіка, у Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі ў рэжыме відэаканферэнцыі з падключэннем аблвыканкамаў адбылося пасяджэнне беларускай часткі рабочай групы па развіцці супрацоўніцтва з Курскай вобласцю Расійскай Федэрацыі. Пасяджэнне правёў кіраўнік беларускай часткі Сумеснай рабочай групы па супрацоўніцтве з Курскай вобласцю, міністр сувязі і інфарматызацыі Папкоў Сяргей Пятровіч.

У Мінскай студыі прысутнічалі прадстаўнікі Міністэрства замежных спраў, Міністэрства прамысловасці, Мінскага аблвыканкама, канцэрна "Белнафтахім". У абласных студыях прысутнічалі прадстаўнікі аблвыканкамаў, Гомельскага аддзялення БелГПП. На відэасувязі сувязі быў і кіраўнік аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Смаленску.

Разгледжаны ход рэалізацыі супрацоўніцтва і развіцця партнёрскіх адносін з Курскай вобласцю ў эканамічнай, гуманітарнай і іншых сферах. Удзельнікі пасяджэння праінфармавалі аб выніках выканання ключавых паказчыкаў эфектыўнасці працы па экспарту тавараў і паслуг у курскі рэгіён па выніках двух месяцаў бягучага года.

Кіраўнік рабочай групы праінфармаваў удзельнікаў аб афіцыйным запрашэнні, якое паступіла ад губернатара Курскай вобласці Міхайлава А.Н. прыняць беларускім прадстаўнікам ўдзел у штогадовым Міжрэгіянальным універсальным аптова-рознічным кірмашы «Курска Корэнскі кірмаш 2018.», які пройдзе з 7 па 10 чэрвеня 2018 года і VII сярэднярускім эканамічным форуме, асноўнай тэмай якога стане - НА ШЛЯХУ ДА ЭКАНОМІЦЫ ВЕДАЎ.

Беларускія прадпрыемствы масава і годна прадстаўляюць сваю прадукцыю на курскай зямлі, Гэта, швейныя і ваўняныя вырабы, мясная і кандытарская прадукцыя, паўфабрыкаты, бытавая хіміі і інш. «Гэты год не стане выключэннем. Фарміраванне афіцыйнай і бізнес-дэлегацыі з удзелам усіх зацікаўленых будзе пачата ў бліжэйшы час», - падкрэсліў Папкоў С.П.

Неабходна адзначыць, што за студзень-люты 2018 года тавараабарот паміж Рэспублікай Беларусь і Курскай вобласцю склаў паміж Рэспублікай Беларусь і Курскай вобласцю склаў 16 млн. Долараў у параўнанні са студзенем-лютым 2017 г. павялічыўся 2,8 працэнта.

На сённяшні дзень рэалізоўваецца План мерапрыемстваў на 2017-2019 гады да Пагаднення паміж Адміністрацыяй Курскай вобласці Расійскай Федэрацыі і Урадам Рэспублікі Беларусь аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве, падпісаны 29 чэрвеня 2017 года ў Маскве.

З 2009 года за Міністрам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь замацавана Курская вобласць Расійскай Федэрацыі і ўскладзена персанальная адказнасць за прасоўванне нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь у гэтым рэгіёне Расіі і актывізацыю двухбаковых адносін.

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/13-04-2018-2944*